# «НАРМАЛЬНАГА ЯШЧЭ НАРОДЗІЦЕ...»

## Дзеці з асаблівасцямі — страх дарослых?




**Сіняя падсвятка, лёгкаатлетычны прабег і выстава фотапартрэтаў асаблівых дзяцей — у Беларусі ўпершыню маштабна пройдзе Сусветны дзень інфармавання аб праблеме аўтызму. Арганізатары акцыі паспрабуюць размаўляць з грамадствам на мове пераканаў.**

### ПРЫЗНАЦЬ ПРАБЛЕМУ

Сёння ўвечары Мінск возьме ўдзел у сусветнай акцыі «Light It Up Blue» («Запалі сінім»). На адзін дзень падсветка сталічных будынкаў стане сіняй — у знак увагі да праблемы аўтызму. Зазіхацяць адным колерам спартыўныя комплексы, аб'екты грамадскага прызначэння, гандлёвыя і бізнес-цэнтры. «Нерэальна даць грошы і вылечыць усіх дзяцей з аўтызмам, але сумесныя дзеянні дапамогуць вырашыць гэтую праблему, — заўважае **начальнік аддзела карпаратыўных камунікацый кампаніі Velcom Вячаслаў СМІРНОЎ.** — Кампанія ніколі не мяняла сімволіку, і робячы гэта, мы звяртаемся не да дзяцей з аўтызмам, а да ўсіх, хто павінен змяніць сваё стаўленне да іх».

У будынку Velcom-цэнтра (пазней і ў іншых выставачных залах Мінска) можна будзе ўбачыць выставу фотапартрэтаў дзяцей з аўтызмам «Я магу!..». Аўтар ідэі — **журналіст, мама дзіцяці з аўтызмам Ірына ДЗЯРГАЧ** кажа:

— 12 дзяцей на партрэтах прымяраюць ролю-мару доктара, праграміста, гоншчыка... Дзіма будзе доктарам. Прычым добрым, які ніколі не скажа некаму словы, што пачула ягоная маці: «Вы маладая, нармальнага яшчэ народзіце... А гэты — ну што ж, асечкі ва ўсіх бываюць. Бацькі вераць, што для сваіх дзяцей змогуць зрабіць свет дружалюбным. Бо многае залежыць ад самых простых рэчаў — вышыні парога, умення настаўніка ствараць «сітуацыю поспеху» для незвычайнага вучня, гатоўнасці кожнага з нас прыняць асаблівасці іншага чалавека...

За мяжой аўтысты нярэдка займаюцца высокакваліфікаванай працай, і ніхто ўжо не ўспрымае іх як людзей з інтэлектуальнай недастатковасцю. У Беларусі сёння пражывае каля 10 тысяч дзяцей з аўтызмам, пры гэтым лічыцца, што статыстыка адлюстроўвае кожны дзясяты выпадак, бо нярэдка бацькі саромеюцца прызнаць праблему. І дарэмна: своечасовая комплексная псіхолага-педагагічная карэкцыйная работа можа змякчыць праявы захворвання.

— Трэба адрозніваць паняцці інтэграцыі і інклюзіі (ад inclusion — «уключэнне», працэс павелічэння ступені ўдзелу грамадзян з асаблівасцямі фізічнага развіцця), — адзначае **кіраўнік Міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяна ЯКАЎЛЕВА.** — Да 90 працэнтаў дзяцей з аўтызмам за мяжой навучаюцца ў сістэме інклюзіўнай адукацыі, а ў нас 90 працэнтаў наогул застаюцца дома. Толькі адзінкі з падлеткаў паступаюць у вучылішчы і тое, як правіла, іх не заканчваюць. Людзей з аўтызмам дагэтуль курыруе сістэма аховы здароўя, урачы-псіхіятры, у той час як у замежнай практыцы гэтыя людзі даўно назіраюцца сацыяльнай сферай. Сем'і на раннім этапе павінны атрымліваць псіхалагічную падтрымку, даведвацца, як кантактаваць з асаблівымі дзецьмі. Дарэчы, пры падтрымцы Velcom мы выпусцілі мабільны дадатак «Камунікатар ДАР» (можна скачаць у адкрытым доступе). Праграма змяшчае больш за 200 карцінак і заснавана на прынятай у свеце сістэме альтэрнатыўнай камунікацыі.



Спецыяльнае псіхолага-педагагічнае суправаджэнне дазваляе дзецям з аўтызмам пайсці ў школу разам са звычайнымі дзецьмі. Аднак спецустановы закрытага тыпу не страцілі ў нас сваёй актуальнасці, што пазбаўляе жывых сацыяльных навыкаў.

— І я заклікаю бацькоў не апускаць рукі, шукаць неабходную інфармацыю, пісаць і званіць — вам дапамогуць іншыя бацькі, дзякуючы якім існуюць цэнтр «Лівання», офіс па правах людзей з інваліднасцю, цэнтр дапамогі аўтычным дзецям, — гаворыць Таццяна. — Пакуль толькі на базе сталічнай СШ №187 створана каманда спецыялістаў, здольная працаваць з асаблівымі дзецьмі. Рэдкія спробы ўкараніць інклюзіўнае навучанне сярод звычайных дзяцей — выключна бацькоўская ініцыятыва. Магу сказаць на прыкладзе свайго сына: яго чакала б спецшкола або надомнае навучанне, калі б мама не была такая актыўная. Але ён пайшоў у звычайную школу і знайшоў там сяброў, умее чытаць і пісаць, расказвае вершы... Расказвае! А калісьці немагчыма было нават марыць аб тым, каб дзіця вымавіла хоць некалькі слоў.

### МЫ ЎСЕ — З АСАБЛІВАСЦЯМІ

Летась, дарэчы, была прынятая Канцэпцыя інклюзіўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. У бліжэйшыя пяць гадоў у кожнай вобласці плануецца стварыць рэсурсныя цэнтры, якія будуць курыраваць пераход да новага віду адукацыі. «Сёння дзеці з асаблівасцямі сядзяць асобна ад звычайных, але гэта можа быць толькі пераходным момантам, — заначае **Прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь Рашэд Мустафа САРВАР.** — Але ў каго няма асаблівасцяў? У мяне таксама ёсць, і мне часам хочацца закрыцца ад усіх і пабыць аднаму. Аўтызм не перашкаджае рэалізацыі таленту — як гэта не перашкодзіла Моцарту стаць выдатным музыкантам. Дзеці павінны быць разам, адаптавацца і жыць з намі».

Першы ў краіне інклюзіўны прабег з удзелам дзяцей з інваліднасцю пройдзе сёння ў парку 900-годдзя Мінска. Каля комплексу «Чыжоўка-Арэна» збяруцца спартсмены, аматары бегу і проста неабыякавыя людзі. Са спецыяльнымі спартыўнымі калясямі пабяжыць і каманда «Крылы Анёлаў». У падтрымку прынцыпу інклюзіі плануе прабегчы 5 км са сваімі дзецьмі і тэхнічны дырэктар кампаніі Velcom Крысціян Лаке. На яго думку, сучаснае грамадства можа і павінна ставіцца да такіх людзей, як да любых іншых.

— Дзеці з інваліднасцю даюць нам добрую порцыю страху, — разважае **дырэктар сацыяльна-дабрачыннай спартыўнай установы «Крылы Анёлаў» Дзмітрый ЦІМАШКОЎ.** — Гэта звязана з тым, што яны непрывабна выглядаюць, іх паводзіны адштурхоўваюць. Мы ведаем, як даляцець да Марса, але не ведаем, адкуль бярэцца дзіцячая інваліднасць, і не ведаем добрых спосабаў выправіць яе. Страх і бяссілле прымушаюць адварочвацца... Наша каманда паспяхова выкарыстоўвае магчымасць пераадолення страху перад дзіцем-інвалідам дзякуючы спартыўным спаборніцтвам. За кароткі час да каманды бегуноў далучыліся 33 чалавекі, 18 з якіх — члены сем'яў, дзе выхоўваюцца дзеці з інваліднасцю. Толькі шасцёра займаліся бегам раней, астатнія пачалі з нуля. І сёння кожны можа прабегчы больш за 5 км. У нашай камандзе ёсць дзіця з аўтызмам, якое прабягае на трэніроўках да 3 км.

За час зімовых трэніровак дзеці правялі ў спецкалясцы для бегу 120 гадзін — яны «прабеглі» 1200 км... сапраўдная свету з шэрымі аблокамі, сонцам, ветрам, птушкамі, спартыўным манежам, асфальтам! А да таго нехта мог сузіраць столь і сцены. Гэта адказ на пытанне «а як дзеці адчуваюць сябе ў калясках, ці не моцна іх трасе?». Яшчэ адзін забег падорыць дзецям шмат эмоцый, і мноства людзей змогуць паглядзець на нашых дзяцей без страху і жалю — з захапленнем, якога і заслугоўваюць пераможцы.

### ХТО ЯГО АБАРОНІЦЬ?

— Наш Цёма выпадае з таго кола дзяцей з аўтызмам, якіх звычайна маюць на ўвазе, — расказвае **мама дзіцяці з аўтызмам Таццяна ПАРШУТА.** — У яго вельмі цяжкая ступень пашкоджання. Яму 8, і ён абсалютна не размаўляе. У 3 гадзікі Цёма перажыў найцяжэйшую аперацыю на галаўным мозгу. Ён умее выконваць толькі прасцейшыя інструкцыі (закінь мячык у баскетбольнае кальцо, раскладзі па скрынях кубікі розных колераў і г.д.). Толькі нядаўна навучыўся сам хадзіць у прыбіральню, браць мяне за руку і весці да таго прадмета, які жадае атрымаць. Цёма займаецца ў цэнтры дапамогі аўтычным дзецям па 2,5 гадзіны. Але дома яму цяжка знайсці занятак. Ён не цікавіцца камп'ютарам, не можа маляваць... Усё, што ён любіць — слухаць пэўную музыку, гуляць у двары, круціць на падлозе мячык. Ён дрэнна спіць па начах, ён практычна пастаянна гучна вакалізуе (выдае гукі), з ім складана зайсці ў магазін, не кажучы пра тэатр ці выставу. У нас амаль не засталося сяброў, таму што нас перасталі запрашаць у госці — з намі нязручна.

Калі ў сям'і з'яўляецца такое дзіця, адзін з бацькоў аўтаматычна страчвае магчымасць працаваць. Я не магу аддаць Цёму нават у спецыялізаваны садок на дзень ці хоць бы на палову дня і пайсці маляваць свае карціны...

— Пасля аперацыі мы цудам выжылі і нам паставілі аўтызм, — дадае **бацька Вячаслаў ПАРШУТА.** — Мы хутка зразумелі, што кваліфікаванай дапамогі чакаць няма адкуль. Знайшлі добрых спецыялістаў у горадзе, аб'ядналіся яшчэ з парай-тройкай сем'яў і арганізавалі цэнтр дапамогі аўтычным дзецям. У 2012 годзе ў нас займалася каля 6 чалавек, а сёння іх 13. Цэнтр поўнасцю функцыянуе на сродкі бацькоў, плюс зусім крыху спонсарскіх ахвяраванняў. На нас, як на бацьках-заснавальніках, ляжыць вялікая адказнасць па стратэгіі развіцця цэнтра, заробках, навучанні спецыялістаў, пошуку спонсараў і г.д. Наша галоўная задача — знайсці нейкі асобны невялічкі будынак замест двух пакояў у панэльным доме на першым паверсе. Бо мы хочам дапамагаць не 13, а 50 сем'ям.

— Мой боль — будучыня Цёмы, — дадае Таццяна. — Сёння мы, бацькі, ёсць, а заўтра раптам... Хто яго абароніць? Яго чакае толькі спецустанова. Таму мы хацелі б пабудаваць такую сістэму дапамогі, каб можна было быць спакойнымі. Калі па праўдзе, сіл проста амаль не засталося... Зроблена так мала. А такіх дзяцей становіцца ўсё больш. Мне кожны дзень бацькі пішуць пісьмы з просьбай дапамагчы.

— На фірме, дзе я працую, я сам сабе дырэктар і свой працоўны графік будую, як зручна мне, — удакладняе Вячаслаў. — Бывае, што цэнтру трэба прысвяціць палову працоўнага дня. Хоць у нас там ёсць і іншыя работнікі — бухгалтэрыя, адміністратар, метадыст, псіхолагі і некалькі актыўных бацькоў. Часта ў выхадныя мы збіраем сходы Савета цэнтра, старшынёй якога я з'яўляюся.

— Так хочацца, каб, акрамя аўтызму, у нашым жыцці было штосьці яшчэ, — заключае Таццяна. — Каб мы ўдваіх ці ўчацвярых (у нас яшчэ ёсць дачушка) куды-небудзь выбраліся. Ці хоць бы проста сядзелі каля вогнішча, захутаныя ў пледы, і смажылі сасіскі...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*protas@zviazda.by*




### ХВАРОБА-ЗАГАДКА

Калі аднойчы ў вашым полі зроку акажацца надзвычай актыўнае, шумнае дзіця, не спяшайцеся коса глядзець і падазраваць яго ў разбэшчанасці. Можа быць, вы проста мала ведаеце пра аўтызм.

Аўтызм — гэта парушэнне развіцця, адхіленні ў паводзінах, зносінах і сацыяльным узаемадзеянні. Гэта страта імкнення да стасункаў з іншымі людзьмі, пагружэнне ў сябе. Ступені цяжару такога расстройства бываюць рознымі. Існуе думка, што ў нашы дні аўтызм сустракаецца ў кожнага 100-га дзіцяці. Найбольш верагодны ён у хлопчыкаў. Дакладныя прычыны аўтызму не ўстаноўлены, хоць і вылучаюць цэлы шэраг прычын, якія маглі яму паспрыяць, тлумачыць **псіхолаг Цэнтра дружалюбнага падлеткам «Поспех» Кацярына БЛІЗНЮК.**

Кожны пацыент мае свае сімптомы, хоць ва ўсіх выпадках прысутнічаюць і агульныя рысы — расстройства маўлення, навязлівае жаданне аднастайнасці (ужыванне адной і той жа ежы, нашэнне аднаго і таго ж адзення і г.д.), манерныя паводзіны (дзіця, напрыклад, пастаянна раскачваецца або пляскае ў далоні), ігнараванне навакольных. Звычайныя з'явы прыроды, бытавыя прадметы могуць выклікаць страх. Цягам многіх гадоў такім дзецям неабходна карэкцыйная работа па індывідуальнай праграме.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

**Организатор аукциона –**
**ЛЕЛЬЧИЦКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

**Предмет аукциона –**
**право заключения договора аренды на земельный участок, площадью 0,0255 га с кадастровым номером 322855100001001458, расположенный по адресу:**
**Гомельская область, г.п. Лельчицы, ул. Советская**

**Имеются ограничения в использовании земельного участка площадью 0,0124 га в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В.**

Целевое назначение использования земельного участка – для установки и обслуживания павильона по продаже промышленной группы товаров (земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Срок аренды земельного участка 25 (двадцать пять) лет.

**Начальная цена продажи – 11 658 554 (одиннадцать миллионов шестьсот пятьдесят восемь тысяч пятьсот пятьдесят четыре) белорусских рубля.**
**Сумма задатка 1 165 855 (один миллион сто шестьдесят пять тысяч восемьсот пятьдесят пять) белорусских рублей.**
**Размер шага аукциона составляет 10% от предыдущей цены, названой аукционистом.**

Условия продажи:
- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;
- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;
- заключение победителем аукциона с Лельчицким районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в установленном порядке государственной регистрации права на земельный участок;
- разработка и утверждение в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;
- снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту;
- освоение земельного участка в срок до шести месяцев после разработки и утверждения проектно-сметной документации;
- осуществления строительства на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

1. **Аукцион состоится 4 мая 2016 г. в 10 00 часов в здании Лельчицкого районного исполнительного комитета, каб. 111 по адресу: г.п. Лельчицы, ул. Советская, 42.**

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели и юридические лица, подписавшие соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона на право заключения договора аренды земельного участка.

Для участия в аукционе необходимо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подать в землеустроительную службу райисполкома в установленный в настоящем извещении срок заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона.

3. **Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30, последний день приема документов – до 17.30 29 апреля 2016 года по адресу: г.п. Лельчицы, ул. Советская, 42. Заключительная регистрация участников 4 мая 2016 г. с 9.00 до 9.45.**

4. **Сумма задатка перечисляется на счет №3641421000035, в ЦБУ № 315 г.п. Лельчицы филиала № 300 ГУО ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, МФО 151501661, УНП 400032854, получатель – Лельчицкий районный исполнительный комитет.**

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

6. Организатор открытого аукциона вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до проведения аукциона.

За дополнительной информацией обращаться Лельчицкий районный исполнительный комитет (землеустроительная служба), контактные телефоны в г.п. Лельчицы: 8 (02356) 5-02-51, 5-08-33.